Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 КРАСАВІКА 2017 г. АЎТОРАК № 73 (28437)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Цяжкая праўда пра Курапаты

СТАР. 5

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

У вашага горада ёсць пабрацім?

Работа такая – ратаваць жыццё

ЛІЧБА ДНЯ

На $350 млн

адкрыта каля 35 тысяч дэпазітных рахункаў на сямейны капітал у ААТ «ААБ Беларусбанк» на 1 красавіка гэтага года, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Гэты від доўгатэрміновай падтрымкі шматдзетных сем'яў быў уведзены з 1 студзеня 2015 года. Сямейны капітал — аднаразовая выдача безнаяўных грашовых сродкаў у памеры $10 тысяч пры нараджэнні, усынаўленні (удачарэнні) трэцяга або наступных дзяцей. У 2015 годзе было адкрыта 11 582 дэпазітныя рахункі, у 2016 годзе — 18 983, у студзені—сакавіку гэтага года — 4 372 дэпазіты. Па словах спецыялістаў, заявы аб прызначэнні сямейнага капіталу, якія паступаюць у мясцовыя органы ўлады, разглядаюцца на працягу аднаго месяца.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.04.2017 г.

Долар ЗША	1,8825	▲
Еўра	2,0014	▲
Рас. руб.	0,0334	■
Укр. грыўня	0,0701	■

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 17073>

УСЁ Ў НАС АТРЫМАЕЦЦА

Фота БЕЛТА.

Беларусь зможа пераадолець усе цяжкасці, і гэты год у пераадоленні стане пераломным

Па традыцыі кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў свята Вялікадня наведвае адзін з храмаў краіны. У гэтым годзе Прэзідэнт адправіўся на ўсход Беларусі — горад Барань Аршанскага раёна, у храм Праабражэння Гасподняга.

Знаходзячыся ў праваслаўным храме, кіраўнік дзяржавы прапанаваў ад імя самай шматлікай рэлігійнай канфесіі ў Беларусі паслаць прывітанне і хрысціянам-каталікам, якія таксама святкавалі Вялікдзень у гэтую нядзелю. «Гэта сапраўды вялікае і светлае свята, як бы ні спрабавалі яго зацямніць у нашай гісторыі. І нават у нядаўняй. Не атрымалася. Таму што ўвесь народ, ад малога да вялікага, заўсёды з найвялікшай павагай і душэўнасцю чакаў гэтых дзён», — адзначыў Прэзідэнт. Ён запэўніў, што з усімі цяжкасцямі Беларусь справіцца. «У нас няма іншага выйсця. І гэты год будзе пераломным», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім свяшчэннаслужыцелям і мітрапаліту Паўлу за тую працу, якую яны ажыццяўляюць у імя беларускага народа і яго суседзяў.

СТАР. 2

СВЯТАЯ НЯДЗЕЛЯ Ў ГАРАДЗІШЧЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанка Валянціна МЯСНІКОВА і случанка Тамара НАЧЫНА прыехалі ў госці да Тамары ВАРАНКОВАЙ — паглядзець на зямлю сваіх продкаў, пакланіцца іхнім магілам.

Беларуска-расійскае памежжа. Старажытная вёска Гарадзішча. Паселішча знаходзіцца на левым беразе Сажа, паміж двума райцэнтрамі — смаленскімі Хіславічамі і магілёўскім Мсціславам. Спакон веку ў Гарадзішчы жывуць не толькі рускія, але і беларусы. Гарадзішчанцы не дзеляць людзей на сваіх і чужых. У працы і на святах, у горы і ў радасці жыхары заўсёды разам. Вось і на Вялікдзень яны разам ідуць у царкву, моляцца, ходзяць у госці адно к аднаму, прыносяць велікодныя прысмакі, прыпамінаюць забытыя традыцыі.

СТАР. 3

■ Надвор'е

Сур'ёзная хваля холаду

Увогуле, сапраўды халодным у нас будзе ўвесь гэты тыдзень і часткова наступны. А цёплае надвор'е прыйдзе ў Беларусь у апошнія дні красавіка, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.

Ён адзначыў, што ў найбліжэйшую дэкаду сярэдняя тэмпература паветра чакаецца на 3—7 градусаў ніжэйшая за норму. Большую палову тыдня ў краіне будзе гаспадарыць зона павышанага атмасфернага ціску, якая сфарміравана ў халоднай паветранай масе.

Чакаюцца замаразкі. У чацвер на працягу сутак ападкаў таксама не будзе. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 да мінус 9 градусаў, а па поўначы ў асобных раёнах чакаецца нават да 11 марозу. Удзень сонечна і 3—8 цяпла, па захадзе краіны — да плюс 10 градусаў. У пятніцу раніцай да паўночна-заходніх раёнаў краіны падыдзе атмасферны фронт, які прынясе кароткачасовыя ападкі, у асноўным у выглядзе дажджу.

СТАР. 3

Чакаецца, што ўначы пачне падмарожваць да мінус 8—11 градусаў

Фота БЕЛТА.